# У БІБЛІЯТЭЦЫ імя В. І. ЛЕНІНА

Штодзенна дзяржаўная бібліятэка гор. Менска выдае творы Александра Іванавіча Герцэна чытачам—рабочым, служачым, студэнтам. Але задаволіць усіх жадаючых творамі пісьменніка бібліятэка не мае мажлівасці, таму ствараецца нават чарга для атрымання такіх кніг, як «Хто вінаваты?», «Былое і думы» і інш.

Да 125-годдзя з дня нараджэння А. І. Герцэна бібліятэкай арганізавана невялічкая выстаўка твораў пісьменніка, якая дае магчымасць пазнаёміцца з этапамі жыцця і творчасці гэтага майстра мастацкага слова, мысліцеля, які «ўстаў на ўзровень з найвялікшымі мысліцелямі свайго часу» (Ленін). Больш тысячы чалавек наведала гэту выстаўку за якіх-небудзь два-тры дні пасля яе адкрыцця.

Самым характэрным для выстаўкі з'яўляецца тое, што яна мае газеты, якія выдаваў Герцэн за граніцай, газеты, якія так цаніў Уладзімір Ільіч Ленін. На выстаўцы прадстаўлены «Полярная звезда» за 1852, 1857, 1862 гг. і «Колокол» за 1865 г. — газеты, якія рэдагаваў Герцэн разам са сваім аднадумцам і другам Огаравым. У студзеньскім нумары «Колокола» за 1865 г. Герцэн і Огараў пішуць:

— «Колокол» астаецца чым ён быў — органам сацыяльнага развіцця ў Расіі. Ён заклікае, як і раней, супроць усяго што перашкаджае гэтаму развіццю і за ўсё, што яму садзейнічае».

«Колокол» паўстаў за вызваленне сялян. «Раб'е маўчанне было парушана»,— піша Ільіч у артыкуле «Памяці Герцэна».

І вось знаёмства з «Колоколом», як і знаёмства з «Полярной звездой», якая друкавала творы дэкабрыстаў, спачувала ім, друкавала творы Пушкіна, Лермантава, выступала ў абарону Чэрнышэўскага, прынясе наведвальніку выстаўкі толькі карысць.

Заслугоўваюць увагі творы А. І. Герцэна розных гадоў выдання. На выстаўцы ёсць некалькі тамоў твораў А. І. выдання 1867 г. — «Былое і думы» (Парыж) і зборнік пасмяротных артыкулаў (Жэнева), рад твораў выдання 1878 г.,

У краіне Советаў Герцэн знайшоў павагу і любоў да сваіх твораў. На выстаўцы прадстаўлены выданні твораў А. І. Герцана, пачынаючы з 1919 года і канчаючы апошнімі гадамі, калі Герцана выдаюць у тысячных тыражах, з прыгожым афармленнем.

Ёсць на выстаўцы і выключна рэдкія рэчы. Так, напрыклад, захаваўся рукапіс пісьменніка «Рускі народ і соцыялізм» (пісьмо к Мішле), які мае каштоўнасць для нашай грамадскасці, і рад вельмі старых выданняў твораў Герцэна на замежных мовах.

Усяго выстаўка мае каля 200 выданняў твораў пісьменніка.

Выстаўку трэба наведаць кожнаму рабочаму, служачаму, студэнту горада, каб шчыльней пазнаёміцца з творамі А. І. Герцэна — дастойнага сына рускага народу.

П. КАВАЛЕЎ.